УДК 009 (476)

# Асаблівасці культурнага жыцця на Беларусі ва ўмовах нацыянальнага адраджэння (1985 –1990-я гг.)

Багдановіч А.Г.
Беларускі нацыянальны тэхнічны ўніверсітэт

Палітыка перабудовы, што пачалася ў сакавіку 1985 года, садзейнічала разгортванню ў Беларусі шырокага руху за адраджэнне нацыянальнай спадчыны. Культура мяняе сваю галоўную арыентацыю – з ідэалагізаванай яна становіцца свабоднай, адкрытай. Ствараюцца ўмовы для развіцця розных літаратурных і мастацкіх накірункаў, школ, светапоглядных арыентацый, дэмакратызацыі духоўнага жыцця, усталявання свабоды творчасці.

Галоўным дасягненнем перабудовы было замацаванне палітыкі галоснасці. 1 жніўня 1990 г. уступіў у дзеянне Закон СССР аб друку, які дэклараваў свабоду сродкаў масавай інфармацыі і недапушчэнне іх цэнзуры. Карэнным чынам змянілася стаўленне да феномену рэлігіі, яе гістарычнай прыроды і ролі ў грамадстве. Пачаўся працэс перагляду царкоўна-дзяржаўных адносін. Асноўныя напрамкі нацыянальна-культурнага адраджэння заканадаўча замацавала Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь, прынятая ў сакавіку 1994 г.

Істотныя змены адбыліся ў сістэме адукацыі рэспублікі, мэта якіх – стварыць сапраўдную нацыянальную сістэму адукацыі, адпавядаючую сусветным стандартам.

Літаратурны працэс 1990-х гг. быў звязаны з адраджэннем і пастаноўкай на першы план праблемы самазахавання беларусаў, іх мовы, культурнай адметнасці сярод іншых народаў.

Нягледзячы на складанасці, у 1980-90-я гады назіраецца тэндэнцыя павялічэння тэатральнай сеткі. Беларускі тэатр паступова вызваляецца ад жорсткай цэнзуры, неабходнасці здачы спектакляў. Дзяржава перастала ўмешвацца ў рэпертуарную палітыку.

У айчынным кінамастацтве праявіліся 2 асноўныя тэндэнцыі – новы позірк на сучаснасць і асаблівая цікавасць да гісторыі. Пачынаючы з 1993 г. у Мінску праводзіцца міжнародны кінафестываль "Лістапад".

Неад'емнай часткай культурнага жыцця рэспублікі сталі музычныя фестывалі. Дзякуючы ім з'яўляюцца новыя калектывы, абуджаецца цікавасць да роднай мовы, фальклорнага мастацтва. Працягвае развівацца беларуская песня.

Выяўленчае мастацтва Беларусі дэманструе багацце стылістычных кірункаў, індывідуальных манер, разнастайнасць тэм, сюжэтаў. Яно характырызуецца міжжанравымі і міжвідавымі ўзаемадзеяннямі.